2. Бердяев, Н. А. Спасение и творчество (два понимания христианства] / Н. А. Бердяев // Путь. - Париж. - № 2. - 1926. - С. 26-46.
3. Давыдов, А. П. Духовной жаждою томим: А. С. Пушкин и становление «срединной» культуры в России / А. П. Давыдов. - Новосибирск: Сибирский хронограф, 2011. - 244 с.

## КУЛЬТУРНАЯ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ ЯК ДАСЛЕДЧАЯ ПРАБЛЕМА Ў РАМКАХ ПАРАДЫГМЫ CULTURAL STUDIES

**А. Д. Крывалап**
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. Блахіна, 29,211440, Наваполацк, Рэспубліка Беларусь
e-mail: a.krivolap@psu.by

У артикуле разглядаецца культурная ідэнтычнасць як частка працэсу рэпрэзэнтацыі культуры, якая носіць перфарматыўны характар і дазваляе лепш зразумець сацыяльна-культурную прыналежнасць чалавека і яго месца ў сацыяльнай іерархіі.

*Ключавыя словъг.* культурная ідэнтычнасць, междысцыплінарны падыход, рэпрэзэнтацыя, "пазіцыя прамаўлення" кропка ідэнтыфікацыі.

## CULTURAL IDENTITY AS A RESEARCH PROBLEM WITHIN THE CULTURAL STUDIES PARADYGMA

**A. D. Krivolap**
Polotsk State University,
Blahina Str. 29, 211440, Novopolotsk, Republic of Belarus
e-mail: a.krivolap@psu.by

The article deals with cultural identity as part of the process of culture representation which is of a performative nature and allows for better understanding of a person's socio-cultural identity and his place in the social hierarchy.

*Key words*: cultural identity, interdisciplinary approach, representation, "pronunciation position", identification point.

Пытанне ідэнтычнасці ў шырокім сэнсе з'яўляецца прадметам даследавання цэлага шэрагу сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. У наш час актуальнасць пытання культурнай ідэнтычнасці павышаецца ў адпаведнасці з павелічэннем хуткасці глабалізацыйных працэсаў і адчування страты ўласнай адметнасці. Гэты

тэкст прысвечаны разгляду падыходаў да разумения таго, што такое культурная ідэнтычнасць. У якасці базавай формы мы будзем выкарыстоўваць міждысцыплінарны падыход, вядомы як культурныя даследаванні (cultural studies).

Тэкстамі, без якіх немагчыма абмяркоўваць пытанне культурнай ідэнтычнасці, на сённяшні дзень з'яўляюцца працы Сцюарта Хола (Stuart Hall) «Культурная ідэнтычнасць і дыяспара» [4] і «Пытанне культурнай ідэнтычнасці» [5]. Першы з іх спачатку быў надрукаваны ў 1989 годзе ў часопісе «Framework» пад назвай «Культурная ідэнтычнасць і кінематаграфічная рэпрэзентацыя», а потым у 1990 годзе перадрукаваны ў зборніку «Ідэнтычнасць: супольнасць, культура, адрозненні» пад назвай «Культурная ідэнтычнасць і дыяспара» і стаў неад'емнай часткай глабальнага дыскурсу культурнай ідэнтычнасці. Тысячы спасылак у акадэмічных тэкстах сведчаць пра яго запатрабаванасць і ўплывовасць.

У чым рэвалюцыйнасць і прывабнасць гэтага тэксту? Аўтар спрабуе праблематызаваць беспраблемны і празрысты, на першы погляд, панятак культурнай ідэнтычнасці. Для С. Хола мае значэнне, адкуль ствараецца наратыў і разгортваецца гісторыя — ўсё гэта мае сэнс і мусіць быць канцэптуалізавана і зразумела. Непасрэдна сам аўтар называе гэта «пазіцыямі прамаўлення» [4, с. 222], якія таксама належаць да культурнай ідэнтычнасці. Усё, што мы пішам і гаворым — мы прамаўляем з пэўнага месца і ў пэўным часе, што ў сваю чаріу заўсёды кантэкстуальна і залежыць ад пазіцый прамаўлення. Іншымі словамі, у кантэксце посткаланіяльных даследаванняў гэта магчыма сфармуляваць у выглядзе пытання, хто мае права пісаць гісторыю краін, які маюць досвед каланізацыі? Калі досвед каланізацыі адносіцца да адмоўнага вызначэння тых ці іншых краін, то ў якасці больш станоўчага сіноніма магчыма прапанаваць «маладыя» краіны, якія адносна нядаўна атрымалі сваю незалежнасць.

У гэтым сэнсе культурную ідэнтычнасць варта разглядаць не як аб'ектыўна існы факт, які робіцца нам даступным праз новыя культурныя практыкі, а «думаць пра яе як пра «вытворчасць», якая ніколі не можа быць поўнасцю завершана, заўсёды ў працэсе, заўсёды ствараецца знутры праз рэпрэзентацыю» [4, с. 222]. Гэта дазваляе ўбачыць перфарматыўны характар культурнай ідэнтычнасці, якая ўвесь час знаходзіцца ў працэсе стварэння.

С. Хол прапануе два магчымых падыхода да вывучэння і канцэптуалізацыі таго, што такое культурная ідэнтычнасць, якія адчыняюць новы гарызонт бачання і ўяўленне супольнасцей.

Першы з іх «вызначае культурную ідэнтычнасць з пункту гледжання адной, агульнай культуры, свайго роду калектыўнага «адзінага сапраўднага я», якое схавана ўнутры шматлікіх іншых, больш павярхоўных або штучна навязаных «я» з ліку тых, што аб'ядноўваюць людзей з агульнай гісторыяй і радаводам. У адпаведнасці з гэтым вызначэннем, нашы культурныя ідэнтычнасці адлюстроўваюць агульны гістарычны досвед і агульныя культурныя коды, якія забяспечваюць нас як «адзіную асобу» стабільнай, нязменнай і бесперапыннай сістэмай спасылак і сэнсаў, знаходзячыся пад рухомымі часткамі і зменлівасцю нашай фактычнай гісторыі. Гэта «адзінства» ёсцьісным, якое знаходзіцца ў аснове ўсіх астатніх, больш павярхоўных па сутнасці адрозненняў. (...) Такое ўяўленне аб культурнай ідэнтычнасці адыгрывае значную ролю ва ўсёй посткаланіяльнай барацьбе, якая так глыбока змяніла наш свет» [4, с. 223]. І гэты першы падыход чымсьці вельмі падобны на распаўсюджанае ў нас разуменне культурнай ідэнтычнасці ў сэнсе імкнення да страчанага ідэалу, вяртання да каранёў, да жывой крыніцы. Таксама падкрэсліваецца значнасць канцэпцыі культурнай ідэнтычнасці для посткаланіяльнага дыскурсу. Дарэчы, і ў іншых даследчых працах адзначана перспектыўнасць «выкарыстання посткаланіяльнай стратэгіі для Беларусі ў сілу аіульных інтэлектуальных установак на даследаванне феноменаў транзітыўнасці і памежжа, суіснавання сацыяльна-культурных сістэм у якасці полікультурнай прасторы» [6, с. 69]. Аднак на сённяшні дзень, калі ў глабальным свеце канчаткова зіубленыя магчымасці для вялікіх наратываў, якія былі б універсальнымі і прыдатнымі для апісання ўсяго, што адбываецца ў глабальным маштабе, пошукі культурнай ідэнтычнасці ператвараюцца ў разуменне ўласных адметнасцей (дробных і не вельмі істотных), якія і ствараюць лакальныя адрозненні.

І гэты ў пэўным сэнсе набліжае нас другога падыходу, прапанаванага С. Холам. У адпаведнасці з якім гэтая другая пазіцыя прызнае, што гэтак жа як існуе шмат кропак падабенства, ёсць таксама і крытычныя кропкі глыбокіх і істотных адрозненняў якія і складаюць тое, «якімі мы ёсць на самай справе»; дакладней — «якімі мы сталі». На думку С. Хола, «культурная ідэнтычнасць — ёсць

пытанне «станаўлення», а таксама «існавання». Яна настолькі належыць да будучыні, наколькі і да мінулага. Гэта не тое, што ўжо існуе, трансцэндэнтна прысутнічае ў пэўным месцы, часе, гісторыі і культуры. Культурная ідэнтычнасць прыходзіць аднекуль, мае гісторыю. Але як і ўсё, што з'яўляецца гістарычным, яна падвяргаецца пастаяннай трансфармацыі» [4, с. 225]. Далёка не ўсё зафіксавана ў нейкім зразумелым мінулым таму, што своеасаблівая гульня з (пера)стварэннем гісторыі працягваецца бясконца. І пошукі культурнай ідэнтычнасці, гэта не простае «аднаўленне» мінулага, якое стамілася ўжо чакаць, калі ж яго знойдуць і заўважаць. Хол фармулюе пытанне: «Ідэнтычнасць грунтуецца не на археалогіі, але на аповедах аб мінулым?» — і станоўча на яго адказвае [4, с. 224]. Бо нават, калі гэтае мінулае і будзе знойдзена, то нам спатрэбіцца знайсці (можа быць нават стварыць] новыя наратывы для апісання мінулага, якім чынам мы зможам пра гэта разважаць. Тым больш, што гэтае мінулае не будзе існаваць у фармаце аднаго для ўсіх. У той жа час яно не з'яўляецца проста вынікам нашага ўяўлення ці фантазмам. Мінулае быццам бы працягвае размаўляць з намі, спасылаючыся на рэальныя, матэрыяльныя і сімвалічныя эфекты.

У гэтым сэнсе «культурныя ідэнтычнасць можа быць зразумела як кропкі ідэнтыфікацыі, як няўстойлівыя пункты ідэнтыфікацыі або швы, якія злучаюць дыскурсы гісторыі і культуры. Не сутнасць, але пазіцыянаванне. Такім чынам, палітыка ідэнтычнасці заўсёды з'яўляецца выключна палітыкай пазіцыянавання, якая не мае абсалютнай гарантыі ў пазбаўленым праблем, трансцэндэнтным "праве паходжання"» [4, с. 226].

Фактычна наяўнасць адрозненняў мае непазбежна непераадольны характар, бо менавіта ў іх і знаходзіцца сэнс. Пры гэтым значэнні тых ці іншых адрозненняў робяцца зразумелымі паступова. Для гэтага патрэбна пэўная праца, каб разгарнуць (быццам бы зняць абгортку), слой за слоем і дабрацца да іншых сэнсаў. І кожны новы ўзровень патрабуе разумення і пазіцыянавання асобы ў дачыненні да гэтай атрыманай інфармацыі. Можна знайсці розныя тлумачэнні гэтаму працэсу, але заўсёды застанецца магчымасць знайсці [прачытаць] наступны слой. Напэўна, відавочным прыкладам такой бяздонная глыбіні для пошукаў сваёй культурнай ідэнтычнасці можа быць гісторыя ці мінулае ў шырокім сэнсе, якія гістарычныя падзеі мы не заўважаем, а да якіх ставімся вельмі паважліва.

На прыкладзе функцыянавання дыяспары С. Хол аналізуе магчымыя варыянты пабудовы культурнай ідэнтычнасці каляровага насельніцтва метраполій былых імперый. Аднак не абавязкова разумець дыяспару ў літаральным сэнсе, як этнічную меншасць, бо гэта можа быць прадуктыўная метафара і ў дачыненні да субкультур ці проста альтэрнатыўнага разумення гісторыі. Як фармулюе С. Хол: «Да ідэнтычнасці дыяспары адносяцца тыя, якія пастаянна ствараюць і ўзнаўляюць сябе раз-пораз ізноў, праз трансфармацыю і адрозненні» [4, с. 235]. Фактычна культурная ідэнтычнасць дыяспары не мусіць адпавядаць нейкаму ідэалу ці ўзору далёкага мінулага, замест гэтага яна павінна адказваць на актуальныя пытанні сённяшняга дня і падкрэсліваць адрозненні яе носьбітаў ад Іншых. У якасці прасторы, у якой адбываюцца гэтыя трансфармацыі, С. Хол працуе з кіно, дакладней феноменам рэпрэзентацыі ў кіно, якім чынам гледачам прапаноўваецца чарговая версія гісторыі Карыбскагарэгіёну. «Гэта спробатэарэтычнага асэнсавання ідэнтычнасці ўяе цяперашнім складзе, але не звонку, а знутры рэпрэзентацыі. Такім чынам кіно разглядаецца намі не як другаснае люстэрка, якое адлюстроўвае тое, што ўжо існуе, але ж як тая форма рэпрэзентацыі, якая здольна прадстаўляць нас як новы від суб'ектаў і тым самым дае нам магчымасць выявіць месцы, з якіх мы прамаўляем»[4, с. 236-237]. Зразумела, што сёння складана кагосьці здзівіць сцвярджэннем, што рэпрэзентацыя з'яўляецца не адлюстраваннем, а канструяваннем у працэсуальным сэнсе. Рэпрэзентацыя культурнай ідэнтычнасці не з'яўляецца выключэннем. Але ж для стварэння гэтых кропак канструявання культурнай ідэнтыфікацыі нам спатрэбіцца нешта стабільнае і насычанае сэнсамі. Гэтым падмуркам, на думку С. Хола, можа быць нацыянальная культура, у тым сэнсе як яе разумеў Франц Фанон: «Нацыянальная культура — гэта не фальклор, не абстрактны папулізм, які сцвярджае, што зможа выявіць сапраўдную прыроду людзей. Нацыянальная культура — гэтаўсё цела намаганняў, што прыкладаюцца людзьмі ў сферы мыслення, каб апісаць, абгрунтаваць і ўхваліць дзеянні, праз якія чалавек сам стварыў сябе і падтрымлівае ўласнае існаванне» [2, с. 233].

Калі С. Хол разглядае патэнцыял кіно для стварэння кропак культурнай ідэнтычнасці, з дапамогай якіх магчыма пераасэнсаваць і стварыць уласную культурную ідэнтычнасць, то магчыма разгледзець гэту практыку ў больш шырокім сэнсе медыя-спажывання.

Не толькі і не столькі кіно будзе ў цэнтры нашай увагі, колькі новыя медыя. Але гэта накірунак для насіупных даследаванняў.

Лоўрэнс Гросберг у сваім тэксце «Ідэнтычнасць і культурныя даследаванні» разважае над уплывам посткаланіяльнай тэорыі на культурныя даследаванні [3]. Калі разуменне ідэнтычнасці з дапамогай пэўнага набору падыходаў і здагадак, прыводзяць да высновы палітызаванасці пытанняў ідэнтычнасці, калі «любое змаганне за ўладу можа і павінна быць арганізавана вакол разумення пытанняў ідэнтычнасці» [3, с. 88]. Але не дастаткова апісваць няроўнасць ці пазначаць наступствы каланіяльнага мінулага. «Культурным даследаванням неабходна выйсці за рамкі мадэляў прыгнёту [...] і неабходна рухацца ў напрамку мадэлі артыкуляцыіі як "трансфарматыўнай практыкі"» [3, с. 88]. Трансфарматыўнай у дачыненні да сацыяльнага.

Л. Гросберг падтрымлівае С. Хола наконт значнасці месца выказвання, калі мае сэнс не толькі хто гаворыць, але і з якой сацыяльнай пазіцыі. І тут варта ізноў адзначыць асобную ролю дыяспары ў разуменні ролі ідэнтычнасці: «Дыяспара падкрэслівае гістарычна-прасторавую цякучасць і інтэнцыяльнасць ідэнтычнасці» [3, с. 92]. Таксама наяўнасць дыяспары адсылае нас да існавання межаў (культурных, адміністрацыйных і інш.]. Але нас цікавяць не межы самі па сабе, а іх выкарыстанне ў працэсе канструявання ўласнай ідэнтычнасці. Калі Іншы не проста апісваецца, а ствараецца, калі мы можам кіраваць як уласнымі адрозненнямі так і тымі ўласцівасцямі, якія мы прыпісваем Іншаму. Як вынік, гэта прыводзіць да таго, што «ў пэўных кантэкстах, ідэнтычнасць можа стаць маркерам законапаслухмянасці людзей ў такіх асаблівых супольнасцях, якія вызначаюць месцы і спосабы маркіроўкі асоб, якія дзейнічаюць у межах структураванай мабільнасці сучаснага жыцця. І гэта тая ідэнтычнасць, да стварэння якой было б варта прыкласці ўсе намаганні» [3, с. 105].

Наступны тэкст С. Хола «Пытанне культурнай ідэнтычнасці» дазваляе акрэсліваe яго разуменне праблемы і пазначае наступныя накірункі даследаванняў. Размову пра ідэнтычнасць ён пачынае з апісання трох канцэпцый: а) суб'екта эпохі Асветніцтва, б) сацыялагічнага суб'екта і в) суб'екта постмадэрна [5, с. 275]. Праблема маніпуляцыі пад выглядам Асветніцтва падрабязна апісана яшчэ прадстаўнікамі Франкфуртскай школы. Аўтаномны, індывідуалізаваны суб'ект мадэрну паспеў «нарадзіцца і памерці»[5, с. 281] у працэсе дэцэнтралізацыі.

Найбольш актуальным для нас сёння з'яўляецца стан суб'ектаў культуры і грамадства з прыстаўкай "пост". Але ж гэты фрагментарнаўспрымаючы светсуб'ектможабыцьперанесеныўпрасторукультурнай ідэнтычнасці. Калі ў часы мадэрну «нацыянальныя культуры былі першакрыніцамі кулыурнай ідэнтычнасці» [5, с. 291], то зараз іх роля змянілася. Калі мы пачынаем інтэрпрэтаваць нацыю якуяўленую супольнасць пасля працы Бенедзікта Андэрсана [1], то непазбежна ўзнікаюць пытанні з існаваннем ідэнтычнасці. Бо мы ўвесь час будзем мець справу выключна з рэпрэзентацыямі і наратывам нацыянальнай культуры. У якасці прыкладу цяжкасцей пабудову нацыі ва ўмовах канца XX стагоддзя (пасля знікнення СССР з палітычнай мапы свету] С. Хол узгадвае прыклады трансфармацыі былых саюзных рэспублік. Калі былі спробы пабудаваць этнічную і рэлігійную супольнасць вакол «гамагеннай культурнай ідэнтычнасці» [5, с. 312]. Аднак праблемы ўзнікалі менавіта з разуменнем мяжы, калі памежныя (але далёка не маргінальныя) меншасці ідэнтыфікавалі сябе з іншымі культурамі. Глабалізацыя мае і адваротны бок — глабальную гамагенізацыю, калі вяртанне да лакальнасці і ўнікальнасці ператвараецца ў сусветны працэс, калі адраджэнне этнічнасці прыходзіць на змену глабальнасці.

У якасці падсумавання адзначым наступнае. Па-першае, посткаланіяльны ўхіл культурных даследаванняў дапамагае больш глыбока асэнсаваць праблему існавання і развіцця нацыянальнай культуры ва ўмовах глабалізацыі.

Па-другое, культурная ідэнтычнасць трактуецца як частка працэсу рэпрэзентацыі і носіць перфарматыўны характар. Іншымі словамі, яна ствараецца не як спроба наблізіцца да нейкага ўзорнага прыкладу, а ствараецца як частка працэсу асэнсавання сябе, свайго месца тут і зараз.

Па-трэцяе, культурная ідэнтычнасць дазваляе лепш зразумець сацыяльна-культурную прыналежнасць актораў і акрэсліць іх месцы ў сацыяльнай іерархіі. Калі мае сэнс не толькі што выказваецца, але і хто (адкуль) гэта прамаўляе.

## Літаратура

1. Андерсон, Б. Воображаемые сообіцества. Размышляя об нстоках н распространеннн нацноналнзма / Б. Андерсон. - М.: Канон-пресс-Ц. - 2001.-288 с.

2. Fanon, F. The Wretched of the Earth / F. Fanon. - New York: Grove Weidenfeld. - 1963. - 320 p.
3. Grossberg, L. Identity and Cultural Studies : Is That All There Is ?/ L. Grossberg // Questions of cultural identity. - London: SAGE. - 1994. - P. 87-107.
4. Hall, S. Cultural Identity and Diaspora / S. Hall // Identity: Community, Culture, Difference; ed. J. Rutherford. - London : Lawrence & Wishart. - 1990.-P. 222-237.
5. Hall, S. The Question of Cultural Identity / S. Hall // Modernity: An Introduction to Modern Societies. - Cambridge: Polity Press. - 1992. - P. 274-316.
6. Матвеенко, А. Г. Постколониальные исследования: проблемы и перспективы // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. - 2016. - № 1 (25]. - С. 69-75.

## ПРОЦЕСС ПОЛИТИЗАЦИИ РЕЛИГИОЗНЫХ ОБЩИН В ИНДИИ В НАЧАЛЕ XX в.

**М. М. Шпет**
Гомельский государственный университет
имени Франциска Скорины, ул. Советская, 104,246019,
Гомель, Республика Беларусь
e-mail: sacramentl4@mail.ru

В статье рассматриваются процессы общественной и политической жизни Индии начала XX в., выраженные в интегрирующеми дезинтегрирующем направлениях во взаимоотношениях разных кастовых движений и религиозных организаций.

*Ключевые слова-,* политизация, интеграция, дезинтеграция, религиозная община, кастовое движение.

## RELIGIOUS COMMUNITIES POLITIZATION PROCESS IN INDIA AT THE BEGINNING OF THE XXTH CENT.

**M. M. Shpet**
Francisk Skorina Gomel State University,
Sovetskaya Str. 104,246019, Gomel, Republic of Belarus
e-mail: sacramentl4@mail.ru

The article considers social and political life processes in India at the beginning of the XXth cent, expressed in integrating and disintegrating directions in different caste movements and religious organizations relations.

*Key words-,* politicization, integration, disintegration, religious community, caste movement.